*Прачытаў — перадай суседу!*

# СЕРАБРАНКА *Вольная*

МЯСЦОВАЯ ГАЗЕТА НЕЗАЛЕЖНАГА ГРАМАДСТВА

**№ 4 (8) красавік 2008**

Хто галоўны вораг прэсы? *(старонка 2)*

Аповед вязня Акрэсціна *(старонка 3)*

Народны пракурор *(старонка 4)*

Наш колер б-ч-б *(старонка 8)*

## На дыктоўку трапілі не ўсе

Як вядома, 23 сакавіка па ўсёй краіне прайшла першая нацыянальная дыктоўка, у якой узялі ўдзел і ўсе ахвотныя серабранцы.




Жыхары Серабранкі паўдзельнічалі ў напісанні 1-й агульнанацыянальнай дыктоўкі

АРТУР ЛАГОДНЫ

Чытайце вынікі віктарыны "90 год БНР" і глядзіце фота пераможцы на **старонцы 6**

Ці амаль усе… Напярэдадні ў суботу, 22 сакавіка, са стосам Вашай газеты былі затрыманыя дзве жыхаркі нашага мікрараёна Алена Н. і Марыя А. Дзвюх пенсіянерак адвезлі ў РУУС, дзе з імі разбірацца прыехаў асабіста намеснік начальніка Сяргей Каяловіч(!). Гэтая службовая асоба загадала запраторыць абедзвюх паджылых кабет за краты – да суда ў панядзелак. Так што ўсю нядзелю вышэйзгаданыя актывісткі дэмакратычнага руху прабавілі ў камеры спецпрымальніка-размеркавальніка на вуліцы Акрэсціна разам з гурмой алкагалічак (**падрабязнасці на с. 3**).

Наастачу згадаем яшчэ пра дэпутатаў, якія нібыта прадстаўляюць інтарэсы жыхароў раёна ў адпаведнай палаце. Гэта ўжо вядомыя чытачам "ВС" Генадзь Давыдзька і Галіна Мазуркевіч.

Серабранцы запрасілі гэтых асоб на дыктоўку, каб, па-першае, далучыць іх да святое дзеі, па-другое, каб пагаманіць з дэпутатамі ў нефармальнай абстаноўцы аб надзённых праблемах. Адпаведныя лісты былі накіраваныя на адрас Палаты Прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу. Адгукнуўся толькі спадар Генадзь, які вуснамі сваёй памочніцы паведаміў, што, на жаль, яму не выпадзе быць разам са сваімі выбаршчыкамі ў бліжэйшую нядзелю, аднак запрасіў прыходзіць да яго ў прыёмныя дні ў раённую адміністрацыю. Прыемна ўсё ж кантактаваць з дзеячамі культуры – заўсёды дадуць культурны адказ, нават калі гэта адмова. А вось спадарыня Мазуркевіч сваім зацятым маўчаннем шчыра расчаравала. Усё ж, законы трэба выконваць і адказваць на звароты грамадзян.

Рэдакцыі хацелася б даведацца, шаноўныя чытачы, а ці не жадаеце вы пабачыць і пачуць сваіх дэпутатаў? Можа, вам будзе цікава паслухаць аб тым, як яны баранілі наш дабрабыт мінулыя 4 гады, беручы ніштаваты заробак з нашых падаткаў (г.зн. кішэняў)? Пішыце, тэлефануйце, выказвайцеся!

kamunikat.org

АКЦЫЯ




МАЛЮНАК ЮРАСЯ НАВІЦКАГА

# Чарнобыльскі Шлях – 2008

Аргкамітэт запрашае жыхароў Серабранкі прыняць удзел у традыцыйным шэсці, прымеркаваным да чарговай гадавіны катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, якая адбылася ў 1986 годзе.

Шэсце пачнецца ад Акадэміі навук (дазволенае ўладамі месца збора) а 14 гадзіне 26 красавіка.

Мерапрыемства адбудзецца пад лозунгамі нязгоды з пабудовай АЭС на Беларусі, вяртання адабраных у чарнобыльцаў льгот, спынення сельгасвытворчасці на забруджаных землях, патрабавання якаснай медыцыны і праўдзівай інфармацыі пра наступствы радыяцыйнага забруджвання для здароўя чалавека.

АНОНС

Неўзабаве на старонках "ВС" з'явіцца гутарка з былым намеснікам Партыі БНФ **Станіславам Гусаком**.

Спадар Станіслаў – высокапрафесійны спецыяліст у галіне энергетыкі, у 90-я гады займаўся распрацоўкай праекта Чарнаморска-Балтыйскага нафтавага калектара, ён мае свой погляд на актуальныя праблемы энергетычнай бяспекі Беларусі. Свае пытанні аб розных аспектах гэтай праблемы (забеспячэнне краіны нафтай, газам, будаўніцтва АЭС і г.д.) дасылайце на адрас выдання.

ПАДАРУНАК

## Уся газета ў адным файле

Рэдакцыя прыняла рашэнне прапанаваць Вам, шаноўны чытач, бясплатную **падпіску на PDF-версію газеты "Вольная Серабранка"**, якую вы зможаце атрымліваць праз электронную пошту, каб чытаць газету на камп'ютары, альбо пасля раздрукоўкі на прынтэры. Для гэтага Вам патрэбна напісаць адпаведны ліст на рэдакцыйны мэйл serabranka@tut.

ПЕРАСЛЕД

# Хто галоўны вораг свабоднай прэсы?

Ці бачыце Вы, шаноўны чытач, нейкую крамолу на старонках Вашай газеты? Ці знайшлі Вы на яе старонках нейкую дужа небяспечную інфармацыю для Вашага жыцця? А вось праваахоўныя органы ўбачылі. Менавіта таму вечарам 22 сакавіка вайсковы патруль(!) затрымаў дзвюх жанчын-пенсіянерак, якія мелі пры сабе некалькі дзесяткаў экземпляраў газеты "Вольная Серабранка" № 3. Жанчын абвінавацілі ў распаўсюдзе матэрыялаў палітычнага характару(!).

Цікава, што афармляць затрыманых на вул. Якубава, 32 жанчын узяўся ўчастковы Павал Сямашка, які абслугоўвае зусім іншую тэрыторыю. Мабыць, мясцоваму міліцыянту, якога на Якубава ўсе ведаюць, не хацела пэцкаць рукі сумнеўнай справай. Трэба ж будзе потым людзям у вочы глядзець.



HTTP://GUVD.GOV.BY

**Участковы Сямашка, які "лавіў" інтэлігентных жанчын-пеніянерак на непадведамаснай яму тэрыторыі**

Участковы распарадзіўся адвесці кабет сталага веку ў Ленінскі РУУС. Там пенсіянеркам учынілі асабісты дагляд, узялі адбіткі пальцаў, пратрымалі больш за 6 гадзін і ў тры гадзіны ночы павезлі ў спецпрымальнік на Акрэсціна! Праваабаронцы, юрысты, кіруючыя работнікі міліцыі суседніх раёнаў гораду, куды рэдакцыя звярталася па каментары, былі, мякка кажучы, моцна здзіўленыя вельмі жорсткім пакараннем за нязначны праступак.

Як высветлілася падчас суда, трымаць пенсіянерак да суда на Акрэсціна распарадзіўся асабіста намеснік начальніка РУУС Сяргей Каяловіч (глядзі фота справа).

Сп. Каяловіч, калі затрыманых жанчын прывезлі ў РУУС, не паленаваўся позна ўвечары вярнуцца на працу і асабіста зрабіць запіс у пратаколе затрымання, каб законапаслухмяных, маючых сталую прапіску і не ідэальнае здароўе пенсіянерак трымалі да суда на Акрэсціна.



Калі пасля абвяшчэння прысуду пра штраф арыштанткі з палёгкай уздыхнулі, бо баяліся трапіць на суткі, суддзя сказаў: "Што мы звеpы, саджаць вас у камеры?"

**А. Л.**

АРЫШТАНЦКІЯ НАТАТКІ

# Гатэль “Акрэсціна”
## Экзотыка не для слабанервовых

Нам удалося адшукаць адну з затрыманых у той вечар (глядзі с.2) жанчын і пагутарыць з ёй. Пра акрэсцінскі побыт распавядае Марыя Аліева:



### Побыт

Мы трапілі ў камеру а 4 гадзіне ночы. Умовы ў ёй не для слабанервовых.

Гэта памяшканне каля 12 квадратных метраў. Ад сцяны да сцяны нешта накшталт драўлянай сцэны з узгалоўем замест падушкі. Ложак – голыя дошкі. Ні коўдры, ні ручніка, ні мыла. Уся казённая бялізна, па словах аховы, разыходзіцца на анучы для жанчын, патрэбныя ў “крытычныя дні”. Напярэдадні Вялікадня пратэстанцкія вернікі перадалі 3 Біблії, расчоскі, зубныя шчоткі. Добра, што мы паспелі патэлефанаваць сябрам, якія перад адпраўкай на Акрэсціна прынеслі нам цёплыя рэчы і ежу. Харчамі, мылам, сурвэткамі мы падзяліліся з жанчынамі, якія праседзелі ў нечалавечых умовах ужо па 4-5 сутак. Спяць зняволеныя ў паліто, куртках, абутку, стараючыся шчыльней прыціснуцца адна да адной – холадна. Прыбіральня без усялякай дзверы ў кутку, побач рукамыйнік. Столь і сцены ў страшных плямах. Відаць, яны ніколі не мыліся і не фарбаваліся ад пабудовы ізалятара.

### Вязень – слова не жаночага роду

Акрамя нас у камеры знаходзілася 4 жанчыны ўзросту ад 22 да 40 гадоў. Самая маладая нешта скрала ў краме і была злоўлена. Другая трапіла на суткі за тое, што яе сябра слухаў гучную музыку ўначы, і суседзі выклікалі міліцыю. Дзе жанчыны чакалі прымусовага накіравання ў лячэбна-працоўны прафілакторый. Раніцай да нас прывялі яшчэ адну кандыдатку ў ЛПП.

Дзве гаротныя арыштанткі былі пазбаўленыя бацькоўскіх правоў. Адна з іх нарадзіла 2 дачкі, якія цяпер у дзіцячым доме. У другой трох дзяцей ад 3 да 14 гадоў даглядае бабуля. Некаторых на волі чакаюць такія ж выпівохі-мужчыны. Ці чакаюць насамрэч…

### Рэжым дня

Раніца. У камеры адчыняюцца дзверы. Нам ставяць вядро, даюць швабру і анучу. Пачынаецца ўборка. Пасля нам прапануюць прыбраць калідор ізалятара. Тыя, хто паляць, згаджаюцца, бо спадзяюцца па кутках знайсці недакуркі, каб пазней, у камеры скруціць “цыгарэту”. У 8 гадзін сняданак: каша, нешта падобнае па колеру на гарбату, хлеб. А 17 гадзіне абед: суп, каша з катлетай. Вечарам зноў каша. Нашы сукамернікі нам сказалі, што пасля таго як з’явіліся мы – “палітычныя” – порцыі хлеба паболелі.

### Выхаваўчыя гутаркі

Пра што размаўлялі? У асноўным мы з сяброўкай пераконвалі жанчын не піць, пачаць жыццё з чыстага ліста, падумаць пра сваіх дзетак, жыць для іх, калі не бачна іншага сэнсу. Адны згаджаліся, другія злаваліся: “Не кампасуйце нам мазгі!” А нам было ніякавата за іх будучыню. Страшна за людзей, якія перасталі быць жанчынамі, маці… Яны нам скардзіліся на сваё жыццё. Мы не знаходзілі пераканаўчых слоў аб тым, як ім можна жыць годна, а патрабаваць ад іх подзвігу не маглі…

### Штраф

Праз 2 ночы і дзень, праведзеныя на Акрэсціна, нас адвезлі ў РУУС, потым у суд Ленінскага раёна. Нас аштрафавалі на 10 базавых велічынь чамусьці за “парушэнне парадку арганізацыі і правядзення вулічных акцый”.

### П’яны, дурны, тутэйшы...

Агледзіцеся вакол сябе, паглядзіце, што робіцца раніцай у дварах дамоў, каля крамаў. Мужчыны, жанчыны з азызлымі тварамі збіраюцца разам, брыдкасловяць, чакаюць адкрыцця магазінаў, каб запасціся “чарнілам”, гарэлкай – даволі даступным таварам на сённяшні дзень. Параўнайце самі кошты мясных, малочных прадуктаў, печыва, цукерак, гародніны і кошт нізкапробнага алкаголю. Міжволі думаецца: мо гэта выгадна ўладам? Выпіўоха ніколі не будзе марыць аб чымсьці іншым, акрамя “чаркі”. Яму не патрэбны ні кнігі, ні газеты, ні падарожжы. Ён не задумаецца, чаму ў іншай краіне жывецца лепей, чаму хтосьці абмяжоўвае яго свабоды і правы. Вядома, што міліцыя адмысловы кантынгент ля крамаў стараецца не заўважаць. Дарэчы, вайсковы патруль у той вечар падабраў п’янага у дрызг мужчыну і даставіў яго па месцы жыхарства, а нас затрымаў і адправіў у турму.

**Запісала Алена Бурак**

### Ад рэдакцыі

**На шчасце, грамадзянская супольнасць не пакінула затрыманых за газеты жанчын сам-насам са сваёй бядой. У суд Ленінскага раёна, калі разглядаліся іх справы, прыехалі вядомыя палітыкі Аляксандр Мілінкевіч, Анатоль Ляўковіч, Анатоль Сідарэвіч, Аляксей Кавалец. Праваабаронцы даслалі высокапрафесійную адвакатку. Усё былі ўзрушаныя рашэннем трымаць пенсіянерак да суда на Акрэсціна. Калі быў абвешчаны прысуд, усе з палёгкай уздыхнулі. Прызначаныя штрафы дапамог сплаціць праваабарончы цэнтр.**

ЧАЛАВЕК

# Народны пракурор з Серабранкі*

Ад 2004 году жыхарка сталіцы Галіна Юбко шукае праўды ў справе сьмерці сваёй сястры Кацярыны. Жанчына дапамагла раскрыць яшчэ адно забойства і выратавала невінаватага чалавека ад турмы.



7 кастрычніка 2004 году ў вёсцы Захараўка Крупскага раёну Менскай вобласьці пасьля пажару на папялішчы ўласнага дому знайшлі цела Кацярыны Юбко. Сястра загінуўшай Галіна Пахомаўна сьведчыць, што сьледзтва адразу пайшло ня так. Жанчына пачала прыватнае сьледзтва з патрабаваньня распачаць крымінальную справу па факце забойства сястры. За гады сьледзтва Галіна Пахомаўна сабрала сотні афіцыйных дакумэнтаў, замацаваных пячаткамі судоў, пракуратуры, МУС і подпісамі адказных асобаў.

***

Галіну Юбко не задаволіла афіцыйная вэрсія прычынаў сьмерці сястры -- вострае атручваньне чадным газам. Яна настаяла на правядзеньні правядзеньня эксгумацыі. Экспэртыза не выявіла прычынаў сьмерці, сьлядоў атручваньня чадным газам не адшукалі. Галіна Пахомаўна настойвала на тым, што сястру абрабавалі і забілі, а каб схаваць сьляды – спалілі дом. Яна самастойна адшукала і прадставіла ў пракуратуру неабходныя доказы. Праз 10 месяцаў была ўзбуджаная крымінальная справа. Першым падазраваны стаў Уладзімер Маркоўскі. Паводле сьведак, пасьля пажару ён хваліўся знаёмым, што назапасіў сабе на ўсю зіму марынадаў (на пажарышчы было выяўлена, што большасьць мэталічных накрывак з марынадаў, нарыхтаваных нябожчыцай, зьніклі). З запісу першых допытаў стала вядома, што вінаватым у забойстве Маркоўскі называў рэцыдывіста Б.. Але пасьля касэта таямніча зьнікла, а падазраваны ўзяў віну на сябе. Факт: біялягічную экспэртызу сякеры, пра якую казаў падазраваны, сьледчы не правёў. Праз восем месяцаў У. Маркоўскага паводле ўласнага прызнаньня асудзілі на 13 гадоў турмы. У касацыйнай скарзе ён пажадаў прадставіць дадатковыя сьведчаньні, але толькі на судовым паседжаньні, бо непакоіўся за сваё жыцьцё. Але да касацыі 19-ці гадовы хлопец, які раней на здароўе не скардзіўся, не дажыў некалькі дзён.

***

Галіна Юбко падазравала ў забойстве сястры і Алесю Белую, аднавяскоўку, якую бачылі ў куртцы, падобнай да той, што насіла памерлая сястра Галіны. Маладая жанчына не патлумачыла, дзе ўзяла тую куртку. У 2005 г. у пажары гіне родны дзядзька Алесі. Г. Юбко заўважае відавочнае падабенства паміж дзьвюма трагедыямі і зьвяртаецца ў пракуратуру. Ранейшая вэрсія няшчаснага выпадку адпадае, выяўляюцца сьляды ўдараў на целе мужчыны. На пажарышчы знаходзяць фрагмэнты курткі, падобнай да той, што зьявілася ў А. Белай пасьля сьмерці К. Юбко. Гэта дае нагоду аднавіць прыпыненую справу па факце сьмерці Юбко.

***

22 жніўня 2005 г. затрымліваюць аднавяскоўца Юбко Леаніда Баравулю. Нягледзячы на тое, што ён меў алібі – на момант забойства знаходзіўся ў суседняй вёсцы, новы сьледчы пакінуў гэта без увагі. За кратамі Баравулю пратрымалі больш за месяц, афіцыйна абвінавацiўшы паводле частак 12 і 15 арт. 139 КК РБ. Даведаўшыся пра гэта, Галіна напісала заяву ў пракуратуру і пацьвердзіла алібі Леаніда. Пад ціскам жанчыны яго вызвалілі з-пад варты. Пазьней Л. Баравуля апіша, як яго прымушалі ўзяць на сябе віну. «Мяне білі, прыкоўвалі кайданамі да батарэі і спрабавалі надзець на галаву сьметніцу, казалі, што пасьля гэтага ў турме я буду мець статус поруч з так званымі «апушчанымі», — напісаў у скарзе на дзеяньні сьледчых Баравуля. Зь ягоных словаў, яму зладзілі вочную стаўку з Алесяй Белай, загадалі запамінаць, што тая скажа, каб паўтарыць тое самае на судзе. Фактычна ён мусіў узяць на сябе забойства. Усё афармілі ў выглядзе яўкі з павіннай.

***

У Вярхоўным судзе чакае разгляду скарга Г. Юбко на дзеяньні загадчыка прыёмнай Адміністрацыі прэзыдэнта Пятра Катушкіна: той у прысутнасьці сьведак заявіў, што сьмерць яе сястры была зьвязаная з ладам яе жыцьця: “Забілі, бо было за што”. Аднавяскоўцы ж характарызуюць памерлую як добрага і спакойнага чалавека, што вёў нармальны лад жыцьця. Звароты Г. Юбко ў суды па абарону гонару і годнасьці не прынесьлі плёну.

працяг на с. 5

ЧАЛАВЕК

працяг са с.4

На сёньня справа Кацярыны Юбко ў чарговы раз спыненая. Галіна Пахомаўна атрымала пастанову аб прыпыненьні крымінальнай справы за подпісам пракурора Менскай вобласьці Міхаіла Сьнегіра. Вось некаторыя найбольш характэрныя вытрымкі зь яе: «*Во-первых, сам Марковский В.В. мёртв и провести с ним очные ставки нельзя. Во-вторых, многие свидетели допрашивались спустя длительное время (до 3 лет) с момента происшествия, причём значительная часть свидетелей находилась в тот период в состоянии опьянения и не помнит подробностей событий. В-третьих, в тот вечер, когда произошёл пожар, события в д. Захаровка происходили очень быстро, большое количество людей двигалось в различных направлениях и предпринимало различные действия на небольшой территории в ограниченный промежуток времени*”.

***

Галіна Юбко не спыняецца. Яна была на прыёме ў міністра ўнутраных спраў Уладзімера Навумава, сустракалася з Генпракурорам, тады яшчэ Пятром Міклашэвічам і міністрам юстыцыі Віктарам Галавановым. Большасьць чыноўнікаў ад яе адмахваецца, кажа жанчына. Яна мяркуе, што ад самага пачатку пракуратура дзейнічала непрафэсійна і цяпер уся машына сілавых структураў намагаецца замяць гэтую справу. Галіна Пахомаўна удзельнічала ў прэс-канфэрэнцыі групы жанчын, ня згодных з рашэньнямі судоў па сваіх грамадзянскіх справах. Там жанчыну назвалі «народным сьледчым»: “Галіна Юбко за чатыры гады набыла досьвед, які дазваляе ёй весьці сьледства паводле самых складаных і заблытаных справаў”.

**С.П.**

ТРАНСПАРТ

# 600 рублёў
## Многа ці мала?

**Віктар Яўмененка**


Артур Лагодны

Улада нас пастаянна намагаецца пераканаць, што праезд у грамадскім транспарце стратны і што трэба падвысіць кошт праезду. Так, пасля апошняга падвышэння тарыфаў на праезд насельніцтва пакрывае 42% выдаткаў на праезд, у той час як бюджэтам г. Мінску прадугледжана выйсці на паказчык 60%. Але паказчык у 42% разлічваўся тады, калі яшчэ ільготы на праезд не былі адмененыя. Вельмі магчыма, што гэты паказчык па афіцыйных дадзеных ужо дасягнуў гэтыя 60%. Але асабіста я не маю веры ў гэтыя лічбы. Давайце параўнаем кошт праезду ў Мінску, Маскве і Кіеве.

Як вядома, 16 снежня 2007 года былі адмененыя ўсе ільготы на праезд у грамадскім транспарце. Зараз квіток на адну паездку каштуе 600 рублёў і 900 рублёў на экспрэс-маршрутах. Маршруткі каштуюць ад 800 руб. да 1 700 руб. Апасродкаваны падлік сведчыць, што мінчук у сярэднім выдаткоўвае ў месяц на праезд 73 тыс. руб. ці 34 даляры. Паводле статыстыкі, сярэдні заробак за сакавік па Мінску склаў 450 даляраў.

Праезд у метро ў Кіеве каштуе 0,5 грн., а гэта 213 беларускіх рублёў. На маршрутке можна праехаць ад 0,5 грн. да 1,75 грн., а гэта ад 213 да 746 беларускіх рублёў. Гэтак атрымліваецца, што кіянін на месяц на праезд выдаткоўвае ў сярэднім 12 даляраў. Сярэдні заробак за сакавік у Кіеве склаў 440 даляраў.

У “нятаннай” Маскве праезд у метро каштуе сапраўды нятанна – 19 RUR ці 1730 беларускіх рублёў. У аўтобусе, трамваі, тралейбусе вы праедзеце за 15 RUR ці 1 368 бел. руб. У маршрутцы вас правязуць за 20–25 RUR ці 1824–2280 бел. руб. Так гаманец жыхара Масквы худзее дзякуючы праезду прыкладна на 100 даляраў у месяц. Сярэдні заробак за сакавік 2008 г. па Маскве склаў крыху больш за 1000 даляраў.

Разлік праезду вёўся ўлічваючы, што чалавек ездзіць на працу і назад, а ў выхадныя ездзіць на базар (краму, госці) і назад.

Як бачым самы дарагі праезд у Маскве, так там “сярэдні” масквіч “у сярэднім” выдаткоўвае на праезд 10% “сярэдняга” заробку, у Менску – 7,6%, у Кіеве – 2,7%. Карацей кажучы, плацім мы амаль столькі ж, колькі і жыхары Масквы. Пры гэтым там не адмяняюць ільготаў (існуе так званая “карта масквіча”, якая дае права на бясплатны праезд у грамадскім транспарце пэўным катэгорыям жыхароў) і не тыцкаюць пальцам, што грамадзяне мала плацяць і штосьці камусьці вінныя. Трэба зразумець, што плацім мы напоўніцу і што можам плаціць менш, пра што сведчыць досвед Кіева.

Што б там не дэкларавалася дзяржчыноўнікамі і іншымі, але штодзённае жыццё нам падказвае, што плацім за ўсё мы па поўным кошце. Толькі ці зарабляем мы так?

90 ГОД БНР



АРТУР ЛАГОДНЫ

# Падведзеныя вынікі конкурсу да 90-х угодкаў БНР

## Нагадаем, ён быў абвешчаны ў мінулым нумары “ВС”

Пытанні гучалі так (*у дужках прыведзены адказы*):

1. У якім будынку адбываўся 1-ы Усебеларускі з’езд – прадвеснік БНР? (*будынак тэатра імя Янкі Купалы*)

2. Калі была абвешчаная БНР? (*9 сакавіка 1918 года 2-й Устаўной граматай*)

3. Якая ўстанова месціцца цяпер у будынку, дзе была абвешчаная незалежнасць БНР? (*па адрасе Валадарскага, 9 зараз месціцца Мінскі аблспажыўсаюз*)

4. Як называўся Урад БНР? (*Народны Сакратарыят*)

5. Дзе нарадзілася цяперашняя Старшыня Рады БНР? (*Стоўбцы*)

6. Колькі ўсяго было старшыняў Рады БНР? (*7*)

7. Як імя і прозвішча нашай суайчынніцы, якая пражыла ў БССР некалькі дзесяцігоддзяў, застаючыся грамадзянкай БНР? (*Ларыса Геніюш*)

Пасля пільнага разгляду дасланых адказаў і працяглых абмеркаванняў у коле рэдкалегіі газеты, падчас якіх было выпіта каля трох літраў гарбаты і з’едзена паўтара кілаграма айчынных кандытарскіх вырабаў, пераможцам вырашана абвесціць Кацярыну С. (глядзі фота ўверсе), якая жыве каля крамы “Палессе”.

Ва ўрачыстай абстаноўцы ёй перададзены прызы: **музычны дыск “НезалежныЯ”** са зборам кампазіцый беларускіх рок-выканаўцаў, падрыхтаваны культурніцкай камісіяй Партыі БНФ да 90-х угодкаў БНР, **перакідны каляндар**, прысвечаны 90-годдзю абвяшчэння незалежнасці БНР, а таксама **збор твораў Алеся Гаруна**, выдадзены ў серыі “Беларускі кнігазбор” (пісьменнік асабіста спрычыніўся да аднаўлення нашай дзяржаўнасці, беручы ўдзел у дзейнасці Вайсковай камісіі БНР).

Дарэчы, Кацярыне “ВС” не трапляла ў паштовую скрыню. Дзяўчына даведалася пра нашае выданне ад сваіх сяброў з Польшчы (!), а ўзяла яго ў сядзібе БНФ, куды прыйшла разам з маці на дыктоўку. Вось такім неймаверным чынам газета знайшла сваю чытачку, а прызы – уладальніцу!

ПОШТА РЭДАКЦЫІ

# Душа баліць за нашы двары

Добры дзень! Я жыву ў Серабранцы. Душа баліць за нашы двары. Увесь час чуеш па тэлевізары: “Дзеці – наша будучыня!” А дзе тая будучыня, калі ў нашых дварах няма добрых дзіцячых пляцовак, арэляў, горак, ды й наогул нічога няма, усё зламана ці заржавела. Няўжо ўсім абыякава, дзе гуляюць нашы дзеці? Затое хапае месцаў для п’яніц. Ёсць сталы і лавы. Заўсёды можна знайсці ўтульны куточак, каб выпіць і закусіць на вольным паветры. Пад вечар страшна выйсці на вуліцу з дзіцём, бо вакол бруд, неахайнасць, лаянка. Паўсюль кідаюць недакуркі, лузгу ад семак – у пясочніцы дзяцей нельга пусціць. Калі зробіш заўвагу, так адкажуць, што наступным разам ужо падумаеш і пройдзеш моўчкі. Але ж хіба можна пра гэта маўчаць?



Я разумею, што такое становішча ў многіх мікрараёнах. Нават міліцыянты да гэтага прызвычаіліся. Патрульныя амаль ніколі не заглядаюць у двары, стараючца не заўважаць выпівох.



А дарогі… Ідучы з дзецьмі гуляць рызыкуеш паламаць ногі. Некалькі гадоў таму, калі маё дзіця было ў калясцы, яно не магло заснуць, бо па дарозе ад кіно “Салют” да парка Грэкавай суцэльныя выбаіны і яміны.

На левым павароце з Ракасоўскага на Малініна вельмі небяспечны пешаходны пераход. Там ужо не аднойчы адбываліся ДТЗ з пацярпелымі. А сам парк. Зноў-такі, усё для выпівох і нічога для дзяцей. Ні дзіцячых пляцовак, ні атракцыёнаў. Можа, хто з адказных чыноўнікаў альбо тая ж дэпутатка Галіна Мазуркевіч прыме нейкія меры?

Што трэба зрабіць, каб мамы разам з дзеткамі маглі спакойна гуляць на вуліцы, каб не баяліся, што дзіця можа атрымаць траўму на паламаных гушкалках? Мабыць шмат залежыць і ад нас саміх, нашай унутранай культуры?

Людзі, давайце разам супрацьстаяць п’янству, хамству, смеццю, якія абрынуліся на нас. Давайце разам ствараць утульны для нас і нашых дзетак асяродак!

**Алена Надзеева (фота аўтара)**

# Дзень Волі прайшоў з размахам... спецназаўскага бота



Тысячы беларусаў выйшлі адзначаць Дзень Волі са сцягамі і кветкамі

АРТУР ЛАГОДНЫ

25 сакавіка. Беларусы сустрэлі чарговыя ўгодкі абвяшчэння незалежнасці сваёй краіны ў атачэнні спецназа.

Намер беларусаў прайсці мірным шляхам па вуліцах сталіцы, каб адзначыць 90-я ўгодкі абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі, сустрэў абсалютна неабгрунтаванае жорсткае непрыняцце сілавікоў. Сотні апранутых у чорнае спецназаўцаў, жаўнераў унутраных войскаў, міліцыянтаў перагароджвалі ходнікі цэнтральных вуліц, адцяснялі жанчын, моладзь, пенсіянераў, якія неслі кветкі, у двары. Асабліва не цырымоніліся амонаўцы, якія трушчылі і тапталі еўрапейскія і беларускія сцягі. У цісканіне пацярпелі жанчыны, моладзь, пенсіянеры, журналісты. Каля сотні дэманстрантаў былі затрыманыя, а потым канвеерным чынам асуджаныя да розных тэрмінаў адміністрацыйных арыштаў. Нягледзечы на тое, што святкаванне было афіцыйна дазволенае, напярэдадні была сканфіскаваная вялікая колькасць плакатаў і транспарантаў, а іх выканаўца, мастак Алесь Марачкін, арыштаваны. Аб усім гэтым карэспандэнтка “ВС” пагутарыла з удзельнікам мірнай маніфестацыі, серабранаўцом Міхалам Жуком.

## Змянілася ўлада, змянілася й дата

**Таццяна Таполя:** Спадар Міхал, як вы мяркуеце, чаму Свята незалежнасці Беларусі кожны раз адзначаецца збіццём мірных дэманстрантаў?

**Міхал Жук:** Да рэферэндуму 96-га наша краіна святкавала Дзень Незалежнасці згодна з сусветнай практыкай, то бок у дзень прыняцця Дэкларацыі аб незалежнасці. Дык паколькі цяперашняя улада аб’явіла, што *“свой народ за цивилизованным миром не поведёт”*, новае афіцыйнае свята прызначылі на дзень вызвалення Мінска ад нямецкім акупантаў. Такім чынам Расеі, спадкаемцы СССР, падаваўся знак: мы вашыя васалы, незалежнасць знішчана, вяртайцеся. Таму пераследуецца нават напамін пра незалежнасць, забараняюцца бел-чырвона-белыя сцягі з Пагоняю, якія да 1995-га былі не толькі гістарычнымі, але і афіцыйнымі сімваламі Рэспублікі Беларусь, знішчаецца ўсё беларускае. Ведаеце, напрыклад, што Таварыству беларускай мовы ўлады паднялі арэнду ажно ў 10 разоў?!

**Т.Т.:** Вы былі на рагу Казлова й Незалежнасці падчас разгону мірнай маніфестацыі. Кажуць, менавіта там адбылося самае жорсткае збіццё і гвалтоўны захоп яе ўдзельнікаў спецназаўцамі.




АРТУР ЛАГОДНЫ

**М.Ж.:** Так. Яны нашываюць на сваю вопратку ці то арлоў, ці то беркутаў, мабыць, як нейкі намёк на высакароднасць. Насамрэч арлы між імі не вядуцца. Чулі пра жывы шчыт, створаны ДАІшнікамі з жанчын і дзяцей? Дык першым выгналі міліцыянта, які пра гэты выпадак распавёў! А на рагу Казлова іхнія дзеянні былі падобныя на дзеянні зграі, якая накідваецца на дужага, але міралюбнага зубра. Яны стварылі можа з трох шэрагаў кола, у якім збівалі дэманстрантаў. Гэта каб не бачылі “нячэсныя журналюгі”.

**Т.Т.:** У вас самога ссажана горла.

**М.Ж.:** Таксама дасталася. Падчас разгону я ўбачыў, як аб толькі што зламаны сцяг Аб’яднанай Еўропы нейкі міліцэйскі начальнік выцірае ногі і пацягнуўся, каб падняць. У наступнае імгненне адчуў удар – і вось я ўжо ў коле. Мяне пацягнулі адразу па “жывым калідоры” са спецназаўцаў да аўтазаку. Але вольнага месца ў ім мне не было, і яны не ведалі, што са мной і наступнымі затрыманымі рабіць. Мы з адным маладым чалавекам скарысталіся сітуацыяй і здолелі вылузацца са амонаўскіх клюшняў. Мне яшчэ пашанцавала. Сярод пацярпелых ад міліцэйскіх дручкоў хапала і людзей сталага веку.

**Т.Т:** І навошта вам гэта трэба? Няўжо наступным разам ізноў пойдзеце?

**М.Ж.:** Канечне, радасці ад такога святкавання мала. Але ж свабода не даецца проста так. Яе трэба заслужыць. Калі мы выстаім, не скарымся, Беларусь абавязкова стане вольнай. 25 сакавіка – гэта нашае свята і нашая незалежнасць у еўрапейскім асяроддзі. Наступным разам я сам разгарну ўратаваны еўрапейскі сцяг!




АРТУР ЛАГОДНЫ

СІМВАЛЫ

**Мы працягваем публікацыі, прысвечаныя нашай нацыянальнай сімволіцы, якія падрыхтаваў сталы аўтар "ВС", жыхар Серабранкі Юрась Навіцкі. Гэтым разам спадар Алесь прапануе Вам, шаноўны чытач, свае нататкі пра бел-чырвона-белы сцяг.**

# Наш колер Бел-чырвона-белы

Папярэдне "Вольная Серабранка" ужо крыху пазнаёміла сваіх чытачоў з дзяржаўным гербам нашага краю "Пагоня", які сёлета святкуе свае афіцыйныя 730-я ўгодкі.

Афіцыйныя, як ужо казалася, таму, што наш спрадвечны герб мае нашмат больш даўнюю гісторыю. Толькі што ранейшых дакументальных згадак не захавалася. Але нават на прыкладзе каралеўскага герба Міндоўга 1252--1253 гг. высвячаецца не менш як чвэрць стагоддзя. З другой паловы XI стагоддзя "Пагоня" выкарыстоўваецца ў якасці родавага герба шэрагу тагачасных беларускіх князёў. А пачынаецца гісторыя Беларусі як мінімум з Полацкага княства. Дык вось, "Пагоня" сустракаецца і на пячатках старажытных полацкіх грамат.

## Сцяг – люстэрка герба

Як памятаеце, "Пагоня" выглядае наступным чынам: на чырвоным шчыце выява срэбранага ўзброенага вершніка, які пераследуе ворага. Па версіі беларускага гісторыка Міхася Чарняўскага, наш сучасны бел-чырвона-белы сцяг адлюстроўвае колеры гэрба. Паводле законаў геральдыкі (згодна з эўрапейскімі геральдычнымі традыцыямі, бо гербы дайшлі да нас з Еўропы), верхняя трацiна сцяга мае колер выявы на шчыце, сярэдняя – колер самога шчыта, а ніжняя – колер шчыта вершніка. Міхась Чарняўскі дадае яшчэ, што чырвоны – спрадвечны колер штандароў і харугваў прабеларусаў.

## Здабытая крывёй свабода

Іншую версію прапануе гісторык Алесь Белы ў сваёй працы "Пад крыжом Святога Георгія (па-беларуску – Юрая – аўт.)" Чытачы ўжо часткова знаёміліся з ёю ў папярэднім нумары "ВС". Дарэчы, менавіта Юр'еўскія крыжы на беларускіх харугвах выразна бачны, напрыклад, на гравюрах 1514 і 1597 гг. Хацелася б дадаць, што Святога Юрая ўзялі на тарчу (у якасці герба) і нашыя ўсходнія суседзі – грузіны і пазней тагачасныя маскоўцы, продкі сённяшніх расейцаў. Па ўсходніх традыцыях Св. Юрая называюць Георгіем. Георгіей у ангельскай транскрыпцыі называецца і сама Грузія. А нацыянальны сцяг у грузінаў – Юр'еўскі, з ягонымі крыжамі ў кожнай долі дадаткова. І ў расейскім нацыянальным сцягу прысутнічаюць белы й чырвоны колеры. Пагоню і Св. Юрая малявалі на сваіх гербах мазаўшане і пскавічы, падляхі і старадубцы, і нават вялікі князь наўгародскі Аляксандар Неўскі, які, паверце мне на слова, у склад БНФ ніколі не ўваходзіў.

Усіх павінна прымірыць народнае паданне пра невядомага беларускага князя, які, узняўшы над параненай галавой залітую крывёю павязку замест штандара, здолеў натхніць на бой знясіленую дружыну і цаной уласнага жыцця ўратаваць Айчыну ад нападнікаў. Яшчэ адна версія такога кшталту: наш сцяг – гэта прасціна, якой накрылі залітага крывёю абаронцу. Ну, і канечне, асноўная версія: наш сцяг – сімвал Хрыстовай плашчаніцы, то бок кавалка тканіны, у які Марыі загарнулі цела забітага Хрыста пасля зняцця яго з крыжа.

Хрыстос уваскрос, дарагія суродзічы!І Беларусь пад Хрыстовым сцягам уваскрэсне!

**Юрась Навіцкі**
**спецыяльна для "ВС"**




**РУП "Белпошта" сёлета выпусціла паштоўку з выявай Ісуса Хрыста і бел-чырвона-белай стужкай. Яна свабодна прадаецца ў 101-м паштовым аддзяленні ў Серабранцы**

## "Пагоня" і нацыянальны сцяг пад аховай дзяржавы

**Між іншым, герб "Пагоня" і бел-чырвона-белы сцяг, як паведаміў агенцтву БелаПАН старшыня ГА "Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры" Антон Астаповіч, зараз знаходзяцца пад аховай дзяржавы. Мінкульт разглядае пытанне аб наданні сцягу статусу нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь. Герб "Пагоня" быў уключаны ў спіс такіх каштоўнасцяў Міністэрствам культуры ўжо некалькі год таму.**

Мясцовае недзяржаўнае грамадска-палітычнае выданне **"Вольная Серабранка"**
Выдаецца на беларускай мове сучасным правапісам за выняткам матэрыялаў, пазначаных "*". Пазначаныя такім чынам матэрыялы захоўваюць правапіс аўтара.

Выдавец і заснавальнік – супольнасць дэмакратычных актывістаў Ленінскага раёна г. Мінска.
Друкуецца пры падтрымцы ЦВІ г. Мінска.
За змест матэрыялаў адказваюць аўтары па меры магчымасцяў.
Галоўны рэдактар – Артур Лагодны.

**Пры выкарыстанні матэрыялаў і фотаздымкаў "ВС" спасылка абавязковая!**
Капіяванне газеты і распаўсюд сярод сваякоў і знаёмых вітаецца.
Рэдакцыйны інтэрнет-адрас: serabranka@tut.by

Рэдакцыйны тэлефон: (+37529)9625143
**РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА БЯСПЛАТНА**
Наклад 299 экз. (дадатковы 1). Замова № 56.
Падпісана ў друк у 18:55 21.04.2008 г.